## МЕСЦА МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў РАЗВІЦЦІ МАРАЛЬНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ АСОБЫ

Г.В.Торхава

Рэальнае месца музычнай культуры ў развіцці маральнага патэнцыялу асобы абумоўлена спецыфікай музыкі як інтанацыйна-вобразнага мастацтва. Галоўную ролю ў змесце музыкі іграюць "мастацкія эмоцыі" - адабрання ў адпаведнасці з магчымасцямі і мэтамі мастацтва, ачышчаныя эмацыянальныя станы і працэсы. Іх вядучая роля ў музычным змесце прадвызначаецца гукавай (інтанацыйнай) і часавай прыродай музыкі, дазваляючай ей, з аднаго боку, аперціся на шматтысячагадовы вопыт знешняга выяўлення людзьмі сваіх эмоцый і перадачы іх другім членам грамадства перш за ўсе праз гукі, а з другога боку, адэкватна выявіць перажыванне як рух, працэс са ўсімі яго змяненнямі і зрушэннямі, дынамічнымі нарастаннямі і спадамі. Таму пераўтвараючы ўплыў музыкі сказваецца на развіцці перш за ўсе стэнічных эмоцый (актыўных форм перажывання), непасрэдна фарміруя ў слухача эмацыянальную ўспрымальнасць і шырокі дыяпазон эмацыянальных пачуццяў.

У маральным жа станаўленні асобы інтэнсіфікацыя працэса развіцця эмацыянальна-пачуццёвай сферы займае адно з вядучых месцаў. Музыка з'яўляецца той базай, на якой, праз сапераживанне, выхоўваюцца суб'ектыўныя адносіны асобы.

Сапераживанне - гэта мастацказнаўчы тэрмін, ужываемы ў псіхалогіі мастацтва для абазначэння працэса ўспрымання мастацкага вобразу. У музычнай псіхалогіі сапераживанне трактуецца як інтэнсіўнае перажыванне, найбольш цесна звязанае з эмацыянальным вопытам індывіда.

Працэс успрымання музыкі можна назваць працэсам успрымання чалавечых пачуццяў, працэсам зносін мноства людзей, пазнання чалавечых узаемаадносін.

Аднак трэба заўважыць, што пры адзіным эмацыянальным пачатку маральныя пачуцці не ў ва ўсім супадаюць: есць людзі, якія гатовы праліць слязу, слухая музыку, а ў жыцці - гэта амаральныя, чорствыя людзі. Таму трэба выхоўваць не эмацыянальнасць наогул, а дзейнае пачуцце з улікам усіх састаўляючых яго кампа-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нентаў (рацыянальнага, эмацыянальнага і паводзіннага).

Сфера прымянення эстэтычных пачуццяў – ў параўнанні з маральнымі – значна шырэй, паколькі ўключае не толькі вельмі прыгожае ў маральным жыцці грамацтва, але і з'явы прыроды, чалавечай дзейнасці, прадметы быту і інш.

На аснове значных эстэтычных перажыванняў утвараецца эмацыянальны вопыт асобы, які аказвае ўздзеянне на яе ўспрыманасці да з'яў навакольнага жыцця. Перажытае пачуцце эстэтычнага ўздыму вызначае ва многім характар дзеянняў чалавека ў падобных жыццевых абставінах становіцца асновай устойлівых эмоцый. Хаця усведамленне з'яўляецца вызначаючым у паводзінах чалавека, але з ростам свядомасці ўзрастае і роля эмацыянальнага, пачуццявага. Таму ў педагагічным уздзеянні неабходна паўней выкарыстоўваць не толькі інтэлектуальныя шляхі выхавання, але і эмацыянальныя. Фарміраванне маралі можа быць эфектыўным толькі на аснове інтэлектуальна-эмацыянальных сувязей, таму што для фарміравання асобы трэба абавязкова і маральныя веды, і адпаведнае пачуцце.

Не ўсякі музычна развіты чалавек абавязкова з'яўляецца узорам высокай маральнасці і высакародства пачуццяў, аднак бясспрэчна тое, што нізкая музычна-эстэтычная культура значна тармозіць выяўленне патэнцыйных магчымасцей духоўнага развіцця асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ